*А. В. Пагоцкая*

# ТЭАТРАЛЬНАЯ АРХІТЭКТУРА БЕЛАРУСІ XIX ст. У КАНТЭКСЦЕ РАЗВІЦЦЯ ЕЎРАПЕЙСКІХ СТЫЛЯЎ

Гістарычны лёс беларускай культуры цесна звязаны з культурай Расіі, Украіны, Польшчы і Літвы. Тэрытарыяльнае, палітычнае, часткова і эканамічнае адзінства абумовіла агульнасць многіх аспектаў іх культуры.

На працэсы фарміравання і станаўлення прафесійнага тэатра ў Беларусі аказвалі актыўнае і, на той час, рашаючае ўздзеянне культурныя традыцыі Рэчы Паспалітай, якія арыентаваліся на Заходнюю Еўропу. Так, у апошняй чвэрці XVIII ст. у Беларусі з’явіліся першыя прафесійныя трупы камерцыйнага – агульнадаступнага – тэатра. У канцы першай паловы XIX ст. у сувязі з палітычнымі і эканамічнымі пераўтварэннямі канчаткова завяршае сваё існаванне прыгонны тэатр. На яго месца прыходзяць «прыватныя антрэпрызы» з польскім, пасля польска-рускім, а затым і рускім рэпертуарам новага кірунку, дзе побач з класічнай трагедыяй выступіла буржуазная драма.

Свецкая архітэктура пачала развівацца значна шырэй сакральнай і ў сувязі з новымі патрэбамі сталі ўзнікаць збудаванні, павінныя служыць патрабаванням гарадоў, патрэбам гаспадаркі, навукі і асветы. Менавіта гэтым патрэбам адпавядаў тэатр, які з палацаў выходзіць на шырокую грамадскую публіку, у асобныя рэпрэзентацыйныя будынкі.

Будынак тэатра становіцца галоўнай тэмай і адной з галоўных задач архітэктараў XIX ст. Тэатр у названы час служыў не толькі для прадстаўленняў, але быў таксама месцам забаў, адпачынку, таварыскіх сустрэч. Гэта істотна паўплывала на будоўлю тэатраў. Многія з іх сталі выдатнымі помнікамі архітэктуры і найважнейшай часткай горадабудаўнічых ансамбляў. Адным са старэйшых стацыянарных тэатраў у Беларусі лічыцца тэатр у Гродне, збудаваны ў 80-х гг. XVIII ст. Будынак складаў частку комплексу дома Тызенгаўза і адносіцца да стылю барока.

Сцэнічныя прадстаўленні адбываліся ў Мінску, Віцебску, Гродне, Магілёве і іншых гарадах Беларусі. Для тэатральных пастановак першыя прыватныя антрэпрызы выкарыстоўвалі памяшканні колішніх прыгонных тэатраў у Гродне, Ружанах,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Слоніме, Шклове, памяшканні ратуш і залы, дзе калісьці адбываліся школьныя прадстаўленні пры езуіцкіх калегіях.

Напрыклад, у Мінску ў першай палове XIX ст. тэатральныя пастаноўкі маглі ўбачыць свет толькі ў двух будынках – у школе былой калегіі езуітаў або зале ратушы, якая знаходзілася таксама на плошчы Высокага рынку. З 1864 да 1877 г. прадстаўленні адбываліся ў будынку Дваранскага сходу.

У той час, калі антрэпрэнёры арэндавалі розныя памяшканні для тэатральных прадстаўленняў, узнікае неабходнасць стварацьтэатры стацыянарныя. Іх аблічча, зразумела, павінна было ўлічваць гарадское асяроддзе і тую стылістыку, якая панавала на даным этапе.

З сярэдзіны XIX ст. пачынаецца новы этап развіцця архітэктуры Беларусі, які атрымаў назву «эклектыка» (з грэч. ekletio – выбіраць). Зварот да архітэктурных форм старажытнасці, ды і бліжэйшага мінулага знаходзіўся ў рэчышчы рамантызму, канцэпцыя якога грунтавалася на маляўнічасці, разнастайнасці форм і ўражлівай вобразнасці. Гэта мастацтва адлюстроўвала асвойванне мінулай гістарычнай рэчаіснасці, што праявілася ў светапоглядзе рамантызму і ў форме рэстаўрацыі мінулых мастацкіх стыляў і прыёмаў формаўтварэння. Нацыянальна-рамантычныя тэндэнцыі ў тэатральнай архітэктуры XIX ст. былі ўласцівы ўсім еўрапейскім краінам.

Дойліды перыяду эклектыкі ў сваіх гісторыка-культурных адшуканнях звярталіся да мастацтва *эпохі Рэнесанса*. Гэта тэндэнцыя назіраецца ў буйнамаштабных будынках тэатраў у Дрэздэне, Веймары, Парыжы, Стакгольме і інш. – ва ўсёй еўрапейскай архітэктуры другой паловы XIX – пачатку XX ст. Архітэктура гарадскога тэатра ў Мінску, пабудаванага ў 1890 г. паводле праекта К. Казлоўскага, таксама набыла выгляд рэнесанснага «палаца».

Незвычайна ўзрастае зацікаўленасць дойлідаў *старажытнарускай і візантыйскай* архітэктурнай спадчынай. Прыкметы неарускага стылю ў 1886–1888 гг. надае будынку тэатра ў Магілёве архітэктар П.Камбураў.

У 1899–1900 гг. інжынерам Л. М. Лангадам распрацаваны праект пабудовы народнага тэатра ў Гродне ў так званым «цагляным стылі», які знаходзіўся ў галіне рэтраспектыўна-рускага стылю.

На гэты час тэатры ўжо былі (альбо будаваліся) у такіх гарадах, як Брэст, Пінск, Бабруйск. Усе названыя будынкі належалі да тыпу

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

рангавага тэатра з плоскім партэрам, ярусамі лож і глыбокай сцэнай.

Такія губернскія гарады, як Віцебск, Гродна, Мінск, Магілёў мелі ўжо на той час свае, хоць і не багатыя, тэатральныя традыцыі. Айчынныя і замежныя трупы рэгулярна наведвалі гэтыя гарады. Але паколькі тут было мала тэатральных памяшканняў, то спектаклі альбо канцэрты даваліся ў грамадскіх будынках: у дваранскіх клубах, актавых залах гімназій, гарадскіх управах, а часам і ў прыватных дамах. Летам спектаклі ішлі ў гарадскіх садах у драўляных памяшканнях.

У сярэдзіне – канцы XIX ст. створаны стацыянарныя тэатральныя будынкі ў Мінску, Магілёве, Віцебску (1845, арх. М. Чарвінскі, не захаваўся; 1889, арх. М. Кляменцьеў), Гомелі (1887–1900).

Безумоўна, ужо ў эпоху Рэнесанса ўзніклі пэўныя элементы беларускай нацыянальнай культуры, асабліва ў галіне літаратуры, мастацтва, грамадска-палітычнай і філасофскай думкі. Так, літаратурная і асветніцкая дзейнасць Францыска Скарыны, Васіля Цяпінскага, Лаўрэнція Зізанія, Мялеція Сматрыцкага, Афанасія Філіповіча і некаторых іншых пісьменнікаў і мысліцеляў адлюстравала пачатковую стадыю станаўлення беларускай нацыі. Разам з тым іх дзейнасць праходзіла ў межах Вялікага Княства Літоўскага, аб'яднанага уніяй з Польшчай у складзе Рэчы Паспалітай, такім чынам не можа быць не заўважанай у гісторыі культуры Літвы і Польшчы.

XIX ст. пакінула нам тэатральную архітэктурную спадчыну, якая з'яўляецца вынікам шырокамаштабнага будаўнічага працэсу, і да нашага часу складае і вызначае не толькі асноўны гісторыка-архітэктурны фон і асяроддзе гістарычных цэнтраў нашых гарадоў, але і рэальны фонд будынкаў, якія ў сваёй большасці выкарыстоўваюцца па сваім першапачатковым прызначэнні.

1. *Кулагін, А.* Мадэрн, відовішча / А. Кулагін // Мастацтва. – 1992. – № 8. – С. 67–71.

2. *Лисневский, И. Е.* В театр иду, как в храм: страницы театральной Беларуси / И. Е. Лисневский. – Минск: Беларус. навука, 1997. – 168 с.: ил.

3. *Чантурия, В. А.* Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии / В. А. Чантурия. – Минск: Полымя, 1986. – 240 с.: ил.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ